**20 жніўня** для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Свіслачанка” **Свіслацкая раённая бібліятэка** арганізавала **фальклорны калейдаскоп “Жывуць традыцыі, квітнее зямля”**.



Вядучыя ў нацыянальных касцюмах сустракалі гасцей караваем, які з’яўляецца сімвалам дастатку, паўнаты жыцця і поспеху. Сустрэча адбывалася ў цёплай, сяброўскай атмасферы, згодна з беларускімі нацыянальнымі традыцыямі.

Пад час мерапрыемтва прысутныя пазнаёміліся з культурай Беларусі, традыцыйным народным касцюмам, беларускай нацыянальнай кухняй, успомнілі народная святы, традыцыі і звычаі беларусаў. Мультымедыйная прэзентацыя “Ад свята да свята” акунула прысутных у працэс святкавання любімых беларусамі свят: Дажынкі, Купалле, Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, а таксама пазнаёміла са звычаямі нашых продкаў святкавання Вялікадня, Тройцы, Радаўніцы.



Зацікавілі прысутных звесткі пра вусную народную творчасць і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Майстар па саломапляценню Ірына Іванаўна Фунт прадэманстравала відэафільм “Майстры Свіслаччыны”, расказала аб правілах нарыхтоўкі і апрацоўкі саломы, прадставіла свае вырабы.



Удзельніца аб’яднання Ганна Уладзіміраўна Зінкевіч прадэкламавала вершы, прысвечаныя Беларусі і малой радзіме.

Агляд тэматычнай выставы “Жыцця адвечныя матывы” пазнаёміў прысутных з ганчарствам і ткацтвам, з разьбой па дрэве і мастацкім роспісам, з беларускім музычным і тэатральным мастацтвам.






На памяць аб сустрэчы Свіслачанкам падарылі буклеты “Беларуская нацыянальная кухня: стравы з густам гісторыі”, а калектыўнае фота і гутарка за кубкам гарбаты з караваем дабавілі пазітыва і добрага настрою ўсім прысутным.

